УДК 9 (476)

# ПОЯС У ТРАДЫЦЫЙНЫМ КАСЦЮМЕ БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН

Раманава А.С., БНТУ
кіраўнік: канд. гіст. навук Якубінская А.Дз.

Паясы на Беларусі з'яўляліся неад'емным элементам жаночага, мужчынскага і дзіцячага касцюмаў сялян. Пояс лічыўся адным з галоўных абярэгаў чалавека, суправаджаючы яго нязменна ва ўсіх жыццёвых праявах ад нараджэння да смерці. Вузкія, тканыя на дошчачках паясы, напэўна, самыя старажытныя з тэкстыльных паясоў, што існавалі на тэрыторыі Беларусі, у XIX ст. іх насілі ў розных куточках нашага краю. Такія паясы ткалі вельмі доўгімі і звычайна абкручвалі імі стан некалькі разоў.

Звычайна беларускія жанчыны насілі вузкія паясы, а мужчыны больш шырокія. Паўсямесна пашыраны былі нешырокія тканыя паясы з кутасамі, махрамі на канцах, якія насілі жанчыны, абкручваючы стан адзін або некалькі разоў і завязваючы адным ці некалькімі вузламі спераду або збоку.

Найбольшае пашырэнне на ўсёй тэрыторыі Беларусі атрымалі тканыя паясы, якия былі шырынёй ад 3 да 20 см, і выраблялiся з выкарыстаннем розных тэхнік: на дошчачках, на бёрдзечку, на ніту, на кроснах. Звычайна мужчыны, жанчыны і дзеці, нават у адной мясцовасці, насілі розныя паясы і па-рознаму іх павязвалі. Дзеці звычайна насілі вузкія паясочкі, канцы якіх завязваліся спераду. Зімовае дзіцячае адзенне іншы раз падпяразвалася больш шырокім тканым пояском. Аднак на Палессі шырокімі тканымі паясамі падпяразваліся і жанчыны. У многіх раёнах пояс павязвалі паверх сарочкі і андарака або зверху світы ці сярмягі.

Пояс служыў сімвалам згоды маладой на шлюб у вясельным абрадзе, які яна дарыла сватам, жаніху, хроснай маці, братам маладога, дружкам, абменьвалася з маладым, што азначала сімвалічнае яднанне. Пояс выконваў магічна-рытуальныя функцыі: ахова ад хвароб, няшчасця, забеспячэнне здароўя, багацця, моцнасці шлюбу, поспеху. Пояс, як частка народнага мастацтва, творыць свой свет красы, гэта культурная памяць народа.